І.М. Гоўзіч

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПАЧАТКУ ХХ СТАГОДДЗЯ
# (Х КЛАС)
## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма факультатыўных заняткаў “Беларуская літаратура пачатку ХХ стагоддзя” знаёміць старшакласнікаў з агульнымі заканамернасцямі літаратурнага працэсу, прапаноўвае для вывучэнння творчасць канрэтных пісьменнікаў пачатку ХХ стагоддзя. Шматаспектна і дэталёва вывучаецца мастацкая спадчына класікаў беларускай літаратуры, з імем якіх звязана станаўленне беларускай маштабнай, нацыянальнай па духу паэзіі і прозы (Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна, Максіма Гарэцкага і інш.). Вучні знаёмяцца з асаблівасцямі станаўлення эпічнай традыцыі, з зараджэннем нацыянальнага ліра-эпасу, са станаўленнем прозы і драматургіі, з пытаннямі выпрацоўкі і станаўлення плыняў, стыляў і метадаў у літаратуры. Надаецца ўвага ўзнікненню нацыянальнай крытыкі і публіцыстыкі. Пры вывучэнні ўлічваецца “паскоранасць” літаратурнага працэсу пачатку ХХ стагоддзя. Праграма заснавана на паглыбленні і пашырэнні асобных тэм базавай агульнаадукацыйнай праграмы па беларускай літаратуры для ІХ – Х класаў, а таксама вывучэнні некаторых новых тэм.

Мэтай факультатыўных заняткаў “Беларуская літаратура пачатку ХХ стагоддзя” з’яўляецца раскрыццё змястоўнасці, арыгінальнасці, непаўторнасці і наватарства творчасці Каруся Каганца, Ядвігіна Ш, Цёткі, Уладзіслава Галубка, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна, Максіма Гарэцкага, Францішка Аляхновіча, Вацлава Ластоўскага, паказ іх ролі ў стварэнні асноўных каштоўнасцей ХХ стагоддзя.

Асноўныя задачы заняткаў – вызначыць істотнае і галоўнае ў кожнай з прапанаваных тэм, паказаць гісторыка-літаратурную панараму пачатку ХХ стагоддзя, навучыць дзесяцікласнікаў арыентавацца не толькі ў свеце

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мастацкіх з’яў, але і ў творчасці асобных мастакоў слова, паглыбіць прыёмы, спосабы і навыкі аналізу канкрэтных літаратурных твораў.

Аб’ёмнасць і значнасць матэрыялу абумоўлівае наяўнасць аглядавых тэм, а наяўнасць манаграфічных тэм тлумачыцца яркімі творчымі індывідуальнасцямі ў нацыянальнай літаратуры азначанага перыяду.

На вывучэнне факультатыўных заняткаў “Беларуская літаратура пачатаку ХХ стагоддзя” адводзіцца 34 гадзіны.

Пералік твораў, пазначаных у праграме, можа карэктавацца настаўнікам у бок памяншэння ў залежнасці ад ступені падрыхтаванасці вучняў.

## ПРАГРАМА ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАЎ
## “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПАЧАТКУ ХХ СТАГОДДЗЯ”

34 гадзіны

### УВОДЗІНЫ

(1 гадзіна)

ХХ стагоддзе як гістарычная эпоха. Асноўныя гістарычныя падзеі (Першая сусветная вайна, рэвалюцыйныя падзеі ў Расіі). Складаныя шляхі сусветнага мастацтва і літаратуры. Пошукі новых спосабаў і форм мастацкага асэнсавання рэчаіснасці на шляхах мадэрнізму.

### ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ХХ СТАГОДДЗЯ

(1 гадзіна)

Значэнне і метадалагічныя прынцыпы перыядызацыі літаратурнага працэсу (А. Лойка, М. Мушынскі і інш.). Характарыстыка асаблівасцей літаратурнага працэсу. Асноўныя заканамернасці літаратурнага развіцця.

### “НАШАНІЎСКІ ПЕРЫЯД”. АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

(1 гадзіна)

Гістарычныя ўмовы развіцця літаратуры пачатку ХХ стагоддзя. Роля перыядычнага друку ў станаўленні нацыянальнай літаратуры. Газеты “Наша доля” і “Наша ніва”, кансалідацыя творчых індывідуальнасцей на платформе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“нашаніўства”. Дыскусія 1913 года. Культурна-асветніцкая і літаратурныя плыні ў нашаніўскім руху.

## ЛІТАРАТУРНЫ ПАРТРЭТ КАРУСЯ КАГАНЦА

(2 гадзіны)

Грамадска-палітычная і асветніцкая дзейнасць пісьменніка. Шматграннасць таленту мастака. Сацыяльна-бытавая і гістарычная праблематыка твораў. Жанрава-стылявыя асаблівасці апавяданняў (“Што кажух, то не вата”, “Прылукі”), казак (“Ваўчок”, “Журавель і чапля”), п’есы “Модны шляхцюк”.

## ЖЫЦЦЁВЫ І ТВОРЧЫ ШЛЯХ ЯДВІГІНА Ш

(2 гадзіны)

Біяграфія Ядвігіна Ш. Культурна-асветніцкая праца. Погляды пісьменніка на чалавека. Пачатак літаратурнай творчасці. “Малая” проза Ядвігіна Ш.: жанрава-стылявыя асаблівасці (“Гаротная”, “Васількі”, “Падласенькі”, “Зарабляюць”, “З маленькім білецікам”). Майстэрства дэталі ў творах.

## ТВОРЧАСЦЬ ЦЁТКІ. ШМАТГРАННАСЦЬ КУЛЬТУРНА-ГАМАДСКАЙ І ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

(2 гадзіны)

Праблемна-тэматычнае і жанравае наватарства паэзіі і прозы Цёткі. Выкарыстанне сімволікі і алегорыі ў творах (“Зялёнка”, “Асеннія лісты”, “Лішняя”). Публіцыстыка Цёткі як выяўленне яе асветніцкіх поглядаў (“Шануйце роднае слова!”). Вобраз паэткі ў літаратуры і мастацтве.

## УЛАДЗІСЛАЎ ГАЛУБОК. СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ І ТЭАТРА

(2 гадзіны)

Стан нацыянальнага тэатра і драматургіі на пачатку XX стагоддзя. Шматграннасць творчай асобы Ул. Галубка. Праблематыка, жанрава-стылявая спецыфіка п’ес Ул. Галубка (“Ганка”, “Пан Сурынта”, “Суд”, “Пісаравы імяніны”, на выбар настаўніка). Майстэтства Галубка-драматурга.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ТВОРЧАЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЬ ЯНКІ КУПАЛЫ

(4 гадзіны)

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Наватарства Янкі Купалы ў развіцці нацыянальнай паэзіі і драматургіі. Вытокі і класічныя адзнакі творчасці мастака. Разнастайнасць тэм, матываў, вобразаў купалаўскай лірыкі (на прыкладзе вершаў “Мужык”, “А хто там ідзе?”, “Бацькаўшчына”, “Прарок”, “У купальскую ноч”, “Як у лесе зацвіталі...”). Скразная ідэя нацыянальнага адраджэння, філасофская антытэза “прарок – натоўп” у лірыцы Я. Купалы. Мастацкая эвалюцыя Купалы-лірыка. Мастацкія пошукі паэта ў рэчышчы рамантызму і сімвалізму. Паэтычны эпас, яго наватарская сутнасць і гісторыка-літаратурнае значэнне (на прыкладзе паэмы “Адвечная песня”). Міфалагічныя і фальклорныя матывы ў паэме. Гістарычная абумоўленасць звароту мастака да драматургічных жанраў. Эвалюцыя Купалы-драматурга (“Паўлінка” (1912), “Прымакі” (1913), “Раскіданае гняздо” (1913), “Тутэйшыя” (1922) (агляд)). Вобраз народнага паэта ў літаратуры і мастацтве.

## ЯКУБ КОЛАС – КЛАСІК БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

(4 гадзіны)

Жыццёвы і творчы шлях мастака. Вытокі творчасці Якуба Коласа. Колас-лірык (аналіз вершаў са зборнікаў “Песні жальбы” (“Наш родны край”, “Я не знаю...”, “Не бядуй!”, “Адлёт жураўлёў”), “Водгулле”(“Покліч”, “Цені-страхі”, “Крыж”, “На чужыне”). Арыентацыя на рэалістычныя традыцыі, выпрацаваныя Ф. Багушэвічам, Цёткай і інш. Сімвалічныя вобразы ў лірыцы паэта, адметнасць рытміка-інтанацыйнай будовы твора. Роля Якуба Коласа ў станаўленні нацыянальнай эпічнай традыцыі. Жанрава-стылявыя асаблівасці “малой” прозы пісьменніка: алегарызм, сімвалізм, арыентацыя на народную мудрасць, увага да складаных пытанняў маральнага выбару (“Казкі жыцця”, апавяданні “Сяргей Карага”, “Крывавы вір”). Ліра-эпас пісьменніка (паэмы “Новая зямля”, “Рыбакова хата”, “Сымон-музыка” (агляд)). Навуковая і грамадская дзейнасць Якуба Коласа (падручнік “Методыка роднае мовы”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мастацкая і навукова-крытычная літаратура пра пісьменніка. Вобраз Коласа ў мастацтве.

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ І БЕЛАРУСКАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДРАДЖЭННЕ

(3 гадзіны)

Перыяды жыцця і творчасці М. Багдановіча. Нетрадыцыйнасць фігуры Максіма Багдановіча ў беларускай паэзіі. Living Рознабаковасць таленту М. Багдановіча. Свядомая ўстаноўка аўтара на красу, на мастацкую аздобленасць верша. Пачатак літаратурнай дзейнасці. Дыскусія 1913 года і пазіцыя М. Багдановіча. “Вянок” як класічная кніга беларускай лірыкі. Завершанасць кампазіцыі кнігі, яе ідэйна-мастацкае адзінства. Майстэрства паэтычнага ўвасаблення гістарычнага лёсу народа. Праблемна-тэматычная навізна цыклаў “Места” і “Мадонны”. Вобраз мадонны як рэнесансны ідэал паэта. Інтэрпрэтатары кнігі. Пошукі нацыянальнага стылю і цыкл “На ціхім Дунаі”. Майстэрства Багдановіча-паэта. Клопаты Багдановіча пра адметнасць беларускай літаратуры. Багдановіч – крытык і тэарэтык літаратуры (арыкулы “Глыбы і слаі”, “За тры гады”). Вобраз паэта ў літаратуры, музыцы, выяўленчым мастацтве.

## ЖЫЦЦЁВЫ І ТВОРЧЫ ШЛЯХ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

(3 гадзіны)

Трагізм лёсу мастака. Гарэцкі – пісьменнік, даследчык літаратуры, мовазнаўца, фалькларыст, перакладчык, публіцыст, рэдактар-выдавец. Праблемна-тэматычнае і жанрава-стылявое наватарства пісьменніка. Вобраз інтэлігента-адраджэнца ў апавяданнях і аповесцях М. Гарэцкага (“У лазні”, “У чым яго крыўда?”, “Дзве душы”). Антываенная скіраванасць твораў пісьменніка (“Рускі”, “Генерал”). Забароненыя творы М. Гарэцкага (“Скарбы жыцця”, “Лявоніус Задумекус”).

## ЖЫЦЦЁВЫ І ТВОРЧЫ ШЛЯХ АЛЕСЯ ГАРУНА

(2 гадзіны)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Перыяды жыцця і творчасці пісьменніка. Пачатак літаратурнай дзейнасці. Творчыя арыентацыі. А.Гарун і беларускае адраджэнне. Думы аб Беларусі – лейтматыў паэзіі А. Гаруна. “Матчын дар” – вяршыня творчасці паэта. Кампазіцыя зборніка. Прынцып колазвароту. Вобраз Радзімы ў творах. Філасофскія вершы А. Гаруна. Творчае засваенне і выкарыстанне фальклору. Паэтычнае майстэрства А. Гаруна. Проза А. Гаруна (апавяданні “Першы снег”, “Пан Шабуневіч”). А. Гарун – публіцыст. Месца і роля А. Гаруна ў беларускай літаратуры.

## ФРАНЦІШАК АЛЯХНОВІЧ – ДРАМАТУРГ

(2 гадзіны)

Перыпетыі жыццёвага лёсу Ф. Аляхновіча. Шматграннасць яго творчай асобы. Класіфікацыя твораў драматурга даследчыкамі з улікам іх жанравай спецыфікі і праблематыкі. Уклад пісьменніка ў станаўленне нацыянальнай драматургіі і тэатра. Наватарства Аляхновіча-драматурга. Ф. Аляхновіч – даследчык гісторыі беларускага тэатра.

## ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ ЯК ПІСЬМЕННІК, НАВУКОВЕЦ, ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ

(2 гадзіны)

В. Ластоўскі як шматгранная і таленавітая асоба. Грамадска-палітычная, навуковая і рэдактарска-выдавецкая дзейнасць. Ідэйна-творчыя ўстаноўкі Ластоўскага. Власт – пачынальнік “нашаніўскай” палемікі ў 1913 годзе. Тэма гістарычнага мінулага ў творчасці пісьменніка (“Троіцкі замак”, “Князёўна Рагнеда”, “Ізяслаў” і інш.). Інтэлектуалізм, філасафічнасць прозы пісьменніка. Цэласны аналіз аповесці В. Ластоўскага “Лабірынт” (далёкае мінулае ў творы, ацэнка філасофска-рэлігійных сістэм, асаблівасці кампазіцыі і стылю). В. Ластоўскі – пачынальнік новых мастацкіх плыняў у нацыянальнай літаратуры.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

(1 гадзіна)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Абагульненне вывучанага пра асноўныя тэндэнцыі ў беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя.

Правядзенне выніковай чытацкай канферэнцыі.

**Прагназуемыя вынікі**

У працэсе навучання вучні павінны авалодаць наступнымі ведамі:

– складанасць і супярэчлівасць эпохі пачатку ХХ стагоддзя;

– асноўныя этапы развіцця нацыянальнай літаратуры;

– асноўныя этапы жыццёвага і творчага шляху К. Каганца, Ядвігіна Ш, Цёткі, У. Галубка, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Гаруна, М. Гарэцкага, Ф. Аляхновіча, В. Ластоўскага;

– асноўныя ідэйна-маральныя праблемы, жанравыя і стылёвыя асаблівасці вывучаных твораў;

– істотныя адзнакі паняццяў: мастацкі вобраз, літаратурны тып, народнасць літаратуры;

У працэсе авалодання ведамі выпрацоўваюцца наступныя ўменні вучняў:

– самастойна працаваць з мастацкімі тэкстамі і крытычнай літаратурай;

– рыхтаваць рэфераты, водгукі на прачытаныя творы, правільна афармляць іх структурныя часткі, бібліяграфію і цытаты;

– параўноўваць і супастаўляць творчасць розных пісьменнікаў, іх, жанравую палітру і асноўныя аспекты мастацкай вобразнасці;

– канспектаваць лекцыі настаўніка і выступленні аднакласнікаў;

– ставіць праблемныя пытанні і прымаць удзел у дыскусіях;

– весці літаратурны дзённік, адлюстроўваючы ў ім асабістыя ўражанні аб прачытаных кнігах, вершах, крытычных артыкулах і г.д.;

– карыстацца літаратуразнаўчымі крыніцамі і даведачнымі матэрыяламі (энцыклапедыямі, даведнікамі, слоўнікамі літаратуразнаўчых тэрмінаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## РЭКАМЕНДАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА


1. Абдзіраловіч І. Адвечным шляхам: Агледзіны беларускага светагляду. – Мн., 1993.
2. Адамовіч А. “Браму скарбаў сваіх адчыняю...” – Мн., 1980.
3. Архіўныя матэрыялы: Да жыцця творчасці Максіма Багдановіча. – Мн., 1996.
4. Багдановіч І. Э. Янка Купала і рамантызм. – Мн., 1989.
5. Барычэўскі Я.І. Паэтыка літаратурных жанраў. – Мінск, 1927.
6. Бугаёў Д.Я. Максім Гарэцкі. – Мінск, 2004.
7. Васючэнка П. Драматургічная спадчына Янкі Купалы: Вопыт сучаснага прачытання. – Мн., 1994.
8. Гапава В. Перачатваючы “Спадчыну” Купалы. – Мн., 1983.
9. Гаранін Л. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя. – Мн., 1996.
10. Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Выд. 5-е. – Мн., 1992.
11. Гарэцкі М. Скарбы жыцця // Полымя. – 1993. – №2.
12. Гісторыя беларускай літаратуры: ХІХ – пачатак ХХ ст./ Пад рэд. М. А. Лазарука і А. А. Семяновіча. – 2-е выд. – Мн., 1998.
13. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.: У 4 т. Т. 1 – 2. – Мн., 1999.
14. Гніламёдаў У. Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларус. паэзію. – Мінск, 2001.
15. Гніламёдаў У. В. Янка Купала: Новы погляд: Дапам. для настаўніка. – Мн., 1995.
16. Дасаева Т. Пошукі героя: З вопыту беларускай прозы 20-х гг. – Мн., 1993.
17. Жураўлёў В. Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана. – Мн., 1991.
18. Зубараў Л. Максім Багдановіч. – Мн., 1989.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

19. Кабаковіч А. Паэзія Максіма Багдановіча: Дыялектыка нацыянальнага і эмацыянальнага. – Мн., 1978.

20. Каваленка В. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. – Мн., 1975.

21. Каваленка В.А. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры. – Мн., 1981.

22. Каваленка В., Мушынскі М., Яскевіч А. Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы. – Мн., 1972.

23. Казбярук У. Рамантычны пошук: Назіранні над беларускім рамантызму пачатку XX стагоддзя. – Мн., 1983.

24. Казбярук У. Светлай волі зычны звон: Алесь Гарун. – Мн., 1991.

25. Калеснік У. Тварэнне легенды: Літ. партрэты і нарысы. – Мн., 1987.

26. Конан У. Святло паэзіі і цені жыцця: Лірыка М. Багдановіча. – Мн., 1991.

27. Лойка А. Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя. – Мн., 1972.

28. Лойка А.А. Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд: У 2 ч. 2-е выд. Ч.2 – Мн., 1989.

29. Лойка А. Максім Багдановіч. – Мн., 1966.

30. Максімовіч В. З гісторыі беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. – Мн., 1997.

31. Максімовіч В. Ідэйна-эстэтычныя асновы беларускага мадэрнізму. – Мн., 1998.

32. Максімовіч В. Паэтычная міфатворчасць Янкі Купалы пачатку XX стагоддзя. – Мн., 1997.

33. Мушынскі М. Ад задумы да здзяйснення: Творчая гісторыя “Новай зямлі” і “Сымона-музыкі”. – Мн., 1965.

34. Мушынскі М.І. І нічога, апроч праўды: Якой быць «Гісторыі беларускай літаратуры». – Мн., 1990.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

35. Мушынскі М.І. Якуб Колас: Летапіс жыцця і творчасці. – Мн., 1982.

36. Навуменка І. Максім Багдановіч. – Мінск, 1997.

37. Навуменка І. Якуб Колас: Духоўны воблік героя. Мн., 1968.

38. Навуменка І. Янка Купала: Духоўны воблік героя. Мн., 1967.

39. Пшыркоў Ю. Летапісец свайго народа: Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа. – Мн., 1982.

40. Рагойша В.П. Вяршыні: З невядомага і забытага пра Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча. – Мн., 1991.

41. Семяновіч А. Гісторыя беларускай драматургіі: XIX – пачатак XX стагоддзя. – Мн., 1985.

42. Сінькова Л.Д. Беларуская проза XX стагоддзя: Дынаміка жанравых структур. – Мн., 1996.

43. Стральцоў М. Загадка Багдановіча. – Мн., 1968.

44. Хромчанка К. Беларуская мастацкая проза (канец XIX – пачатак XX стагоддзя). – Мн., 1979.

45. Шамякіна Т.І. Беларуская класічная літаратура і міфалогія. – Мн., 2001.

46. Ялугін Э. “Без эпітафіі”. – Мн., 1989.

47. Янка Купала: Энцыклапедычны даведнік. – Мн., 1986.

48. Янка Купала і Якуб Колас: Некаторыя аспекты творчасці. – Мн., 1982.

49. Янушкевіч Я. Неадменны сакратар Адраджэння: Вацлаў Ластоўскі. – Мн., 1995.

50. Ярош М.Р. Янка Купала і Якуб Колас: Параўнальны аналіз творчасці. – Мн., 1988.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ